# ЛІТАРАТУРНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА ЯК ФОРМА АКТЫЎНАГА І ДЗЕЙСНАГА ПАЗНАННЯ РАДЗІМЫ, ЯЕ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

А.В. СВІРЫДАВА
*Установа адукацыі "Мар'інагорскі дзяржаўны ордэна "Знак Пашаны" аграрна-тэхнічны каледж імя У.Е.Лабанка"вірыдава*

**Анатацыя:** Літаратурная гісторыя аднаго рэгіёна – адзін з складаючых элементаў гісторыі Айчыны. У рабоце разглядаецца прыклад арганізацыі літаратурнага краязнаўства ў межах установы адукацыі і ўплыў такой дзейнасці на станаўленне асобы навучэнца.

Пад літаратурным краязнаўствам разумеюць вобразна-выхаваўчую і пазааўдыторную работу, у ходзе якой вывучаюцца літаратурныя факты, з'явы, падзеі, звязаныя з той мясцовасцю, дзе знаходзіцца ўстанова адукацыі. Для нас гэта – Пухавіцкі раён Мінскай вобласці. Гэты рэгіён нарадзіў шмат талентаў, якія сталі вядомыя далёка за яго межамі. Гэта і Алесь Бачыла, пад песню на яго словы "Радзіма мая дарагая" прасыналася не адно пакаленне беларусаў. Гэта і Міхась Чарот, па яго аповесці "Свінапас" быў зняты першы мастацкі фільм "Лясная быль" на кінастудыі "Беларусьфільм" у 1926 годзе. Колькі паэтаў, празаікаў, крытыкаў выйшла на шырокую прастору мастацкага слова – адразу і не палічыш. Шмат краязнаўчага матэрыялу дораць нам кнігі Алеся Карлюкевіча "Літаратурная карта Пухаўшчыны", "І векавечны толькі край…", "І марам волю дам…", "Сцежкамі Ігуменшчыны", "Радзімазнаўства". А ў кнізе "Пухавіччына: літаратурнае гняздо Беларусі" для чытачоў і даследчыкаў роднага краю ўказана больш за сорак літаратурных адрасоў у цэнтральным рэгіёне нашай краіны. Гэта сапраўдная літаратурна-краязнаўчая энцыклапедыя, якая расказвае, не толькі пра мясціны, дзе нарадзіліся будучыя майстры слова, а і як і ў сувязі з якімі падзеямі з'яўляліся тыя ці іншыя мастацкія творы пісьменнікаў-землякоў.

Слаўных літаратурных імёнаў шмат, але адно з іх для нас асабліва дарагое. Гэта імя беларускага паэта-сатырыка Захара Якаўлевіча Біралы. Ён не толькі наш зямляк, ён – былы выкладчык беларускай мовы і літаратуры ў нашай установе адукацыі, якая ў яго бытнасць называлася Мар'інагорскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Менавіта з яго імем звязана літаратурна-краязнаўчая дзейнасць, арганізаваная ў кабінеце беларускай мовы і літаратуры ў апошнія гады.

Захар Бірала пайшоў у свет з вёскі Раўнаполле, якая знаходзіцца ў Пухавіцкім раёне. Імя гэтага таленавітага чалавека не страчана, але і не на слыху. Энцыклапедычная звесткі вельмі скупыя, а творчасць – глыбінная. Сатырычныя вершы Захара Біралы, напісаныя ў другой палове мінулага стагоддзя, актуальныя і сёння: яны выкрываюць тыя праявы жыцця, якія ва ўсе часы лічыліся заганамі. І хоць назва малой радзімы магла прарочыць "роўную жыццёвую дарогу", шлях паэта аказаўся складаным. Нарадзіўшыся ў 1906 годзе, за 87 гадоў жыцця Захар Якаўлевіч спазнаў усе цяжкасці свайго часу.

Рыхтуючыся адзначаць 110-годдзе з дня нараджэння паэта, мы цесна супрацоўнічалі з Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеем, шукалі тых, хто быў знаёмы з Захарам Якаўлевічам, - збіралі матэрыял. Нарэшце пазнаёміліся з дачкой і сынам. Знаёмства перарасло ў сяброўства. Сям'я Захара Якаўлевіча

Біралы перадала ў народны музей гісторыі ўстановы адукацыі “Мар’інагорскі дзяржаўны ордэна “Знак Пашаны” аграрна-тэхнічны каледж імя У.Е.Лабанка” архіў пісьменніка. Гэта дало магчымасць даведацца пра асобу беларускага сатырыка значна болей, чым напісана ў літаратурных даведніках. На падставе архіва Захара Біралы ў народным музеі гісторыі каледжа створана экспазіцыя “Калючыя ружы лёсу Захара Біралы – земляка, паэта, выкладчыка”. У яе аснове ляжаць зборнікі паэта, яго рукапісы, дагаворы, карткі, публікацыі ў перыядычных выданнях, дакументы – усё гэта выклікае вялікую цікавасць наведвальнікаў, бо дазваляе прасачыць шлях рукапіса да друкаванай кнігі. Адным з каштоўных экспанатаў з творчай спадчыны Захара Якаўлевіча можна лічыць запіску, напісаную ў апошнія дні жыцця паэта: “Што падабаецца, тое не забываецца. Адзін дзень і той здаецца годам, асабліва цяпер…”. Вытрымка з гэтага аўтографа стала загалоўкам для даследчай работы, у якой прадстаўлены нашы знаходкі і разважанні. У адборачным этапе рэспубліканскага конкурсу “Славутыя роды краю майго” ў намінацыі “Повязь часоў: лёсы ў гісторыі” работа “Што падабаецца, тое не забываецца” адзначана Дыпломам трэцяй ступені. Пры вочнай абароне дадзенай работы на рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Беларусь, ты збудавана з беларускіх слоў…” у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры навучэнец другога курса Малашук Даніла таксама заняў трэцяе месца. Паэту-выкладчыку прысвечана і даследванне “Ружы ў крапіве на жыццёвым шляху Захара Біралы” для ўдзелу ў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Зямля – наш агульны дом”, якую праводзіць Маладзечненскі дзяржаўны політэхнічны каледж, у якой прымаў удзел старэйшы брат Данілы, Мікіта, - там таксама атрымалі дыплом трэцяй ступені. Гэта сапраўдны поспех і выдатны вынік для навучэнцаў, якія займаюцца ў аграрна-тэхнічным каледжы і збіраюцца стаць тэхнікамі-электрыкамі.

Істотнай складаючай часткай літаратурнага развіцця навучэнцаў побач з цікавасцю да мастацкага слова і культурай чытання я лічу ўменне назіраць і расказваць пра ўбачанае і пачутае. Работы, выкананыя на мясцовым матэрыяле, падкупляюць шчырасцю, захопленасцю іх аўтараў прадметам апісання і наяўнасцю элементаў мастацкасці. А захапленне прыгажосцю заўсёды спрыяе развіццю творчых здольнасцей навучэнцаў.

Творчая дзейнасць па даследванні жыццёвага і творчага шляху Захара Біралы для навучэнцаў пачалася са знаёмства з экспазіцыяй “Калючыя ружы лёсу Захара Біралы – земляка, паэта, выкладчыка” ў народным музеі гісторыі ўстановы адукацыі. Навучэнцы заўважылі, што выдадзеных кніг і надрукаваных вершаў не так і шмат, нягледзячы на тое, што змест вершаў цікавы, захапляльны і актуальны. Цікавасць да асобы аўтара ўзмацнілася падчас музейнага мерапрыемства – квэста “Вандроўка па вуліцы Рудовіча ў пасёлку Мар’іна”. Адно з заданняў квэста – сфатаграфаваць будынкі, на якіх размешчаны мемарыяльныя дошкі ў гонар знакамітасцяў. Іх у нас толькі дзве, і адна з іх – якраз на доме, дзе жыў паэт. Навучэнцы задумаліся, чаму сярод дзясяткаў знакамітых імёнаў, якія маюць месца ў гісторыі ўстановы адукацыі, абрана імя Захара Біралы для ўшанавання памяці пра яго і такім чынам. Наступным штуршком для больш глыбокага вывучэння жыццёвага і творчага шляху паэта-

сатырыка сталі сустрэчы з членамі яго сям'і, а таксама з людзьмі, якія былі былі асабіста знаёмыя з Захарам Біралам. Дачка, Марыя Захараўна, расказала, якім ён быў бацькам і мужам. Суседзі – якім сябрам. Выпускнікі і калегі – якім выкладчыкам. Пісьменнікі і краязнаўцы (Алесь Карлюкевіч, Уладзімір Рунцэвіч, Аляксандр Прановіч) – якім калегам па пісьменніцкай дзейнасці. Сустрэчы і ўспаміны далі магчымасць скласці больш поўны партрэт пісьменніка і выкладчыка.

Вывучэнне творчасці Захара Біралы не ўключана ў праграму па беларускай літаратуры, але ў архіве пісьменніка, які передала ў музей сям'я, былі кнігі беларускіх аўтараў – сяброў паэта, з творчасцю якіх мы знаёмімся на вучэбных занятках. Я брала гэтыя кнігі, якія маюць аўтографы, адрасаваныя Захару Якаўлевічу, для ілюстрацыі біяграфічнага матэрыялу – і значнасць гэтых творцаў павялічвалася. Праз аўтографы на кнігах, якія трымалі ў руках розныя пісьменнікі, ствараюцца ўмовы для развіцця вобразнага мыслення, творчых пачаткаў у навучэнцаў. Пры гэтым вывучэнне беларускай літаратуры набывае трапяткі характар, што істотна ўплывае на зацікаўленасць літаратурай. Як ужо было адзначана, энцыклапедычныя звесткі пра Захара Біралу вельмі скупыя, а сустрэчы з яго блізкімі і знаёмымі далі магчымасці скласці больш поўны і цікавы яго партрэт і як пісьменніка, і як чалавека. Далей – знаёмства з друкаванымі творамі, іх аналіз. Потым – работа з рукапісамі. І ў выніку атрымалася грунтоўнае даследванне, якое сёння ўключана ў актыўны адукацыйны працэс: дапоўнена экспазіцыя ў народным музеі гісторыі ўстановы адукацыі; пашырана экскурсійнае суправаджэнне; распрацавана інтэрактыўная віктарына па біяграфіі і творчасці Захара Біралы; падрыхтаваны прэзентацыі для абароны даследвання на навукова-практычных канферэнцыях, іншых мерапрыемствах і конкурсах; аформлены артыкулы для публікацыі ў перыядычным друку, прычым не толькі ў раённым, а і ў рэспубліканскім. Напрыклад, у газеце "Літаратура і мастацтва" надрукаваны артыкул "Калючыя ружы Захара Біралы".

На разгледжаным прыкладзе літаратурна-краязнаўчай дзейнасці можна сцвярджаць, што падчас гэтага працэсу навучэнцы атрымліваюць шмат дадатковых звестак пра пісьменніка, чытаюць і перачытваюць яго творы, звяртаюцца да дадатковай літаратуры і ў выніку глыбей авалодваюць ідэйна-вобразным зместам мастацкіх твораў. Краязнаўчыя матэрыялы даюць магчымасць лепш зразумець і адчуць жыццёвыя карані твораў. Пісьменнік правільней і паўней успрымаецца праз яго канкрэтныя, часта будзённыя справы, праз яго адносіны з людзьмі з блізкага для навучэнцаў асяроддзя. У такім выпадку ён больш натуральна становіцца для чытачоў жыццёвым ідэалам.

Заняткі літаратурным краязнаўствам пашыраюць уяўленне навучэнцаў пра такія складаныя эстэтычныя паняцці, як творчая задума і яе ўвасабленне ў творы, аўтарскі ідэал, роля фактаў, назіранняў і фантазіі ў рабоце над творам, сродкі мастацкай тыпізацыі і інш. Большасць пісьменнікаў у сваёй творчасці ідуць ад асабіста перажытага, таму нельга адрываць яе ад таго асяроддзя, дзе яны нарадзіліся, выраслі і жылі, бо асяроддзе накладвае адбітак на іх светапогляд, дае першы жыццёвы вопыт і матэрыял для будучых твораў. Пра гэта сведчаць

шматлікія прызнанні саміх пісьменнікаў, а таксама даследчыкаў псіхалогіі творчага працэсу.

Займаючыся літаратурным краязнаўствам, навучэнцы далучаюцца да пошукавай і даследчай дзейнасці. Іншы раз такія пошукі выяўляюць новыя матэрыялы пра жыццё і творчасць пісьменніка, пра яго акружэнне, узбагачаючы ўяўленне пра творцу. Я лічу, што літаратурнае краязнаўства з'яўляецца крыніцай узбагачэння навучэнцаў ведамі, а таксама дзейсным сродкам выхавання любові да літаратуры, мастацкага слова і радзімы. Вывучэнне літаратурнага жыцця на малой радзіме садзейнічае прыцягненню навучэнцаў да навукі ўвогуле. У такім працэсе навучэнец не мае гатовага тэксту, які распавядзе яму пра пісьменніка-земляка. Займаючыся такой дзейнасцю, ён павінен сам прыняць удзел у яго складанні. Пры гэтым навучэнцу трэба самастойна аналізаваць факты, рабіць уласныя вынікі, шукаць прычынна-выніковыя сувязі. Безумоўна, ён абмяркоўвае іх з выкладчыкам, які павінен умела, часам незаўважна, кіраваць самастойнай дзейнасцю навучэнца. Вельмі важна, каб навучэнец фармуляваў рабочыя гіпотэзы, шукаў доказнасць сваіх меркаванняў, правяраў сабраны матэрыял, выкарыстоўваў розныя крыніцы інфармацыі, адказна адносіўся да навуковага і публіцыстычнага афармлення не толькі работы, але і таго матэрыялу, які назбіраў (гэта правільны запіс успамінаў, афармленне спасылак на матэрыял з інтэрнет-крыніц, сістэматызацыя знойдзенага матэрыялу). Калі навучэнец зробіць пералічанае, то яму будзе значна лягчэй пры абароне работы на розных канферэнцыях. Яго можна прыцягваць пры правядзенні экскурсій, пазааўдыторных мерапрыемстваў. Навучэнец становіцца не толькі даследчыкам, а і арганізатарам, вядучым.

Сістэматычны збор звестак па літаратурным краязнаўстве спрыяе назапашванню багатага і цікавага матэрыялу, які дапамае, дзейсна пазнаць Радзіму, яе гісторыю і культуру – а гэта неад'емная складаючая ў выхаванні маладога патрыёта.

Ёсць такое цудоўнае слова – радзімазнаўства, якое з'явілася з лёгкай рукі беларускага пісьменніка, нашага земляка Алеся Мікалаевіча Карлюкевіча. Я часам замяняю ім тэрмін "краязнаўства", бо веру, што ў хуткім часе з'явіцца і такая галіна навукі – радзімазнаўства. І настане той шчаслівы момант, калі выкладчыкі і навучэнцы, настаўнікі і вучні, дарослыя і дзеці пачнуць яе вывучаць больш поўна. Зразумела, што дарослыя пойдуць наперадзе, будуць дэманстраваць сваю дасведчанасць у гісторыі родных мясцін, абуджаючы ў падрастаючага пакалення жаданне яе спасцігаць. Малодшыя пойдуць за дарослымі, каб не толькі ўпітваць ужо існуючы досвед, але і рабіць самастойныя адкрыцці, якія стануць нашым падарункам нашчадкам.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Буторына, І. Сцяжынкамі радзімазнаўства / І.Буторына. – Мінск: Белпринт, 2013. – 280 с.

2. Канюта, В. У пасёлку Мар'іна з'явілася мемарыяльная дошка Захару Біралу Бірала [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа:

https://zviazda.by/be/news/20160226/1456499307-u-pasyolku-marina-zyavilasya-memaryyalnaya-doshka-zaharu-biralu. – Дата доступа: 27.02.2016.

3. Карлюкевіч, А. І марам волю дам: літаратурная карта Пухавіччыны / А. Карлюкевіч. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2011. – 304 с.

4. Карлюкевіч, А. Краязнаўчы рэсурс у вывучэнні беларускай літаратуры / А. Карлюкевіч. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2015. – 296 с.

5. Карлюкевіч, А. Пухавіччына: літаратурнае гняздо Беларусі / А. Карлюкевіч. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2020. – 320 с.

6. Методыка выкладання беларускай літаратуры: Вучэбны дапаможнік. / Л.В.Асташонак, Г.С.Гарадко, Г.М. Ішчанка і інш.; Пад рэд. В.Я.Ляшук. – Мінск: ТАА “Асар”, 2002. – 416 с.

7. Свірыдава, А. Калючыя ружы Захара Біралы / А.Свірыдава // Літаратура і мастацтва – 2022. – 9 верасня. – С.10.